«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Берасці асудзілі працаўніка завода АКБ

19.08.2019 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Суддзя Брэсцкага раённага суда Сяргей Маручак.

Жыхара вёскі Хабы Брэсцкага раёна **Віктара Мігалюка** судзілі за ўдзел у масавым мерапрыемстве, якое адбылося яшчэ ў красавіку - 4 месяцы таму.

Суд адбыўся 16 жніўня.

Як паведамляе "Брэсцкая вясна", тады ў красавіку, Мігалюк не змог прысутнічаць на судзе па хваробе - знаходзіўся ў шпіталі. Але ад "правасуддзя" у нашай краіне не схаваешся ні ў шпіталі, ні за даўніной часу.

Сведка з боку міліцыі **Дзмітрый Яцэнка** распавёў на судзе, што Віктар, калі ішоў разам з іншымі пратэстоўцамі, крычаў: "Не заводу АКБ!". Вядома, што на відэа ягоныя словы падцверджання не знайшлі.

Суддзя Брэсцкага раённага суда **Сяргей Маручак**, даў веры міліцыянту - прызнаў Віктара Мігалюка вінаватым ў правапарушэнні, прадугледжаным ч. 1 арт. 23.34 КаАП (парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў) і пакараў штрафам у памеры 3 базавыя велічыні.

Опубликовать









Агляд навінаў палітвязняў з 5 па 13 снежня

"Чалавек выгаворвае табе ўсе свае страхі". Як аказваюць медыцынскую і псіхалагічную дапамогу асуджаным да смяротнага пакарання

"Пусціўся ў слэм пад "Груз", а ў галаве — ўспаміны пра тыдзень у халодным ШІЗА..." Вялікая размова з экс-следчым, асуджаным па "справе карагодаў"

У анкахворага палітвязня прагрэсуе хвароба. Ён праходзіць курсы хіміятэрапіі ў турэмнай лякарні







Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Як былыя палітвязні пасля вызвалення бароняць правы зняволеных

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Шаркаўшчынскія чыноўнікі пачалі перадвыбарчую агітацыю

На Магілёўшчыне таксама не паведамляюць імёны сябраў выбарчых камісій

У Магілёве вызначаная рэкордная колькасць месцаў, забароненых для перадвыбарчых пікетаў

За 10 данатаў палку Каліноўскага мужчыну асудзілі да 5 гадоў калоніі

Насупраць ГУБАЗіКа, каля Акадэміі навук і гандлёвых цэнтраў. У Мінску з затрымкай вызначылі забароненыя месцы для перадвыбарчых пікетаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Лістапад 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY